# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 35 (635) | Субота, 20 снежня 1986 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.


## НА ПЛЕНУМЕ АБКОМА КПБ

**У мінулую суботу адбыўся IV пленум абласнога камітэта Кампартыі Беларусі.**

**Па дакладу першага сакратара абкома КПБ А. С. Камая абмеркавана пытанне «Аб перабудове работы пярвічных партыйных арганізацый вобласці і ўзмацненні іх уплыву на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця працоўных калектываў у святле патрабаванняў XXVII з'езда КПСС і IV пленума ЦК КПБ».**

**Пленум заслухаў і абмеркаваў інфармацыю члена абкома КПБ, старшыні абласнога савета Беларускага рэспубліканскага добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць, рэктара ГДУ Б. В. Бокуця аб праводзімай арганізатарскай і выхаваўчай рабоце па выкараненню п'янства і алкагалізму.**

**Пленум перавёў першага сакратара абкома ЛКСМБ У. К. Траццякова з кандыдатаў у члены абкома КПБ і выбраў яго кандыдатам у члены бюро абласнога камітэта партыі.**

*У зоне асаблівай увагі*

## ЦЁПЛЫМІ БЫЛІ СУСТРЭЧЫ

Група студэнтаў нашага універсітэта, сярод якіх было 15 прадстаўнікоў біялагічнага факультэта і двое дзяўчын з матфака, выязджала ў Нараўлянскі раён. Мэтай паездкі была прапаганда біялагічных ведаў, расказ студэнтаў аб вучобе, летніх практыках, цікавых мерапрыемствах, якія праводзяцца ў ГДУ.

Кожная сустрэча, а іх было пяць, з вучнямі сярэдніх школ, жыхарамі раёна заканчвалася невялікай канцэртнай праграмай.

З цікавасцю глядзелі вучні малодшых класаў слайды, зробленыя студэнтамі біяфака А. Нікалаевым і С. Зязюліным у час іх практыкі ў Лапландскім запаведніку, на Паўночным Каўказе, у Сухумскім гадавальніку малпаў. Паказ слайдаў суправаджаўся цікавымі расказамі аб жыцці жывёл. Такая пазнавальная наглядная інфармацыя прынесла школьнікам радасць знаёмства з багатым светам фауны нашай краіны.

Мяняліся школы, а разам з імі і твары, але ўсюды, дзе б ні выступалі, нас прымалі вельмі цёпла.

Мы з болем у сэрцы ўспрынялі ў свой час вестку аб аварыі на Чарнобыльскай АЭС. А вось цяпер нам прадставілася магчымасць выступаць перад жыхарамі раёна, які ўвайшоў у зону асаблівай увагі. Мы змаглі пераканацца ў тым, як людзі спакойна жывуць, працуюць, дзеці ходзяць у школы. Лепшай узнагародай для нас былі вясёлыя смех і гарачыя апладысменты хлопчыкаў і дзяўчынак, перад якімі мы выступалі.

З добрым гумарам выконвалі для іх сцэнку «Варона і сыр» А. Саварын і С. Ярмак, спявала вясёлыя песні трыо ў складзе Л. Міхаленка, С. Касаевай і А. Сацюка. У праграму нашай канцэртнай праграмы былі ўключаны таксама патрыятычныя песні, якія студэнты прысвяцілі 43-й гадавіне з дня вызвалення г. Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. А з пародыямі выступаў В. Трапезнікаў, выносілі на суд гледачоў свае новыя вершы В. Хадан і Н. Доўста, у выкананні А. Сіліна гучалі песні на вершы У. Высоцкага і Б. Акуджавы. Своеасаблівым было выкананне народных песень Э. Цуранковым. Спадабаўся ўсім арыгінальны танец са свечкамі, з якім выступілі В. Кабылянская і І. Чудноўская.

Графік нашых сустрэч быў напружаным: заканчвалася выступленне ў адной школе і адразу ж ехалі ў наступную. Дзвадзілася хутка ўносіць папраўкі ў рэпертуар, зыходзячы з інтарэсаў гледачоў.

Хочацца сказаць вялікае дзякуй дырэктару абласной станцыі юных натуралістаў У. Д. Будзюхіну за вялікую дапамогу ў арганізацыі і правядзенні паездкі, загадчыку Нараўлянскага райана Д. М. Фешчанку за цёплы прыём.

Ад'язджаючы з Нароўлі, мы жадалі яе жыхарам моцнага здароўя, поспехаў у працы, вялікага чалавечага шчасця, мірнага неба і гаварылі ім: «Да новых сустрэч!».

С. ЖАГОЛКІН,
сакратар камсамольскага бюро біялагічнага факультэта.

*УДАСТОЕНА ЎРАДАВАЙ УЗНАГАРОДЫ*

## ШЧОДРЫ ТАЛЕНТ ЧАЛАВЕЧНАСЦІ



Сярод тых, хто сёлета ўдастоены высокай урадавай узнагароды, — медаля «За працоўную доблесць» — дацэнт нашай кафедры Тамара Пятроўна Гараніна. Глыбінная сутнасць гэтага чалавека — у жыццёвай цэласнасці, падпарадкаванай зацвярджэнню чалавечнасці, дабра, высокай духоўнасці.

Тамара Пятроўна адносіцца да тых людзей, якія поўнасцю выяўляюць сваю індывідуальнасць у прыналежнасці да значных грамадскіх спраў. Яна — вопытны лектар, педагог, этык не проста па сваёй кваліфікацыі, а па ўнутранаму прызванню. Этычны пачатак асвятляе і абагачае сабой усе бакі жыцця і дзейнасці Тамары Пятроўны. І ў гэтым — аснова яе творчай, беспакойнай, трапяткой і чулай натуры.

Як арганізатар народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання студэнтаў, Тамара Пятроўна аддае яму шмат духоўных сіл і энергіі, стваральнага парыву. Гэта тая справа надзвычайнай выхаваўчай значнасці, у якой яна ў поўнай меры праяўляе свае арганізатарскія здольнасці і духоўную сталасць. Цяжка пераацаніць ролю народнага універсітэта ў фарміраванні маральнай і эстэтычнай культуры, абагачэнні духоўных патрэб, пашырэнні кругагляду студэнцкай моладзі. Тамара Пятроўна далучае да супрацоўніцтва ў народным універсітэце як выкладчыкаў, так і творчую інтэлігенцыю — усіх, хто захоплены мастацтвам, хто можа адухатварыць студэнцтва ідэаламі прыгажосці і дабра.

Сёлета народны універсітэт ГДУ стаў пераможцам Усесаюзнага агляду-конкурсу народных універсітэтаў культуры і ў лютым 1987 года будзе прадстаўлены на ВДНГ СССР.

Духоўная шчодрасць і чуласць, уменне суперажіваць, сціпласць прынеслі вялікую павагу да Т. П. Гаранінай усіх, хто хоць раз меў магчымасць адчуць яе дабрату і асабістую абаяльнасць. Яна — гуманіст у поўным сэнсе гэтага слова, таму што сардэчны слых, адчуванне другога чалавека, накіраванасць на яго, здольнасць разумець людзей, клапаціцца аб іх складаюць сэрцавіну яе ладу жыцця.

Шырокі дыяпазон Т. П. Гаранінай у грамадска-палітычным жыцці горада і вобласці. Ва ўсіх сваіх імкненнях яна звернута да людзей, да іх думак і пачуццяў. Але чым бы ні займалася Тамара Пятроўна, — ці нясе яна людзям этычныя веды як пазаштатны лектар абласнога і гарадскога камітэтаў партыі і выкладчык вячэрняга універсітэта марксізму-ленінізму, ці займаецца як кіраўнік сектара маральнага выхавання інстытута сацыялагічных даследаванняў пры гаркоме КПБ вывучэннем думак працоўных па хвалюючых пытаннях, ці праводзіць пасяджэнне навукова-метадалагічнай секцыі ў таварыстве «Веды», — усюды яна выконвае свае абавязкі не фармальна, а па ўнутранай маральнай патрэбе.

Грамадзянская пазіцыя, творчы духоўна-маральны патэнцыял, якасці інтэлігентнасці, талент чалавечнасці, якія ўласцівы Т. П. Гаранінай, дазваляюць гаварыць пра яе як аб сапраўды сучаснай асобе, усведамляючай усю меру адказнасці за свой прафесіянальны, грамадскі і чалавечы абавязак.

Л. НЯДЗЕЛЯ,
загадчыца кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму, дацэнт.

## ДА ЎВАГІ ДЭЛЕГАТАЎ

23-га снежня ў 15 гадзін у зале пленумаў Цэнтральнага РК КПБ (вул. Сялянская, 14) пачнецца VII справаздачна-выбарная канферэнцыя таварыства «Веды» Цэнтральнага раёна.

Рэгістрацыя дэлегатаў з 14 гадзін.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат гісторыка-філалагічнага факультэта, кафедра рускай літаратуры горача віншуюць асістэнта НЯНАДАЎЦА Аляксея Міхайлавіча з выпадку зацвярджэння яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

**ВАК прысвоіла вучонае званне дацэнта кандыдатам эканамічных навук А. І. Канашэвічу, Н. П. Пухавай з кафедры палітэканоміі, В. А. Труханаву з кафедры эканомікі працы. Рэктарат, партком, Савет кафедр грамадскіх навук, калегі па працы горача віншуюць іх з гэтай нагоды і жадаюць ім новых поспехаў у навукова-педагагічнай і грамадскай дзейнасці.**

## СТУДЭНЦКАЯ ТВОРЧАСЦЬ

# МУЗЫКА НА ТРАІХ

Былі кветкі і апладысменты, усмешкі і цёплыя словы падзякі сяброў, гледачоў. А яны стаялі на сцэне ўсхваляваныя, крыху разгубленыя і шчаслівыя. Гэты вечар быў асаблівым, адказным, таму што менавіта з творчай справаздачы іх невялікага калектыву, якая прайшла з вялікім поспехам, пачынала жыццё яшчэ адна традыцыя ў студэнцкім клубе мастацкай самадзейнасці універсітэта.

У кожнага з траіх да музыкі быў свой шлях. Святлана Касаева «захварэла» ёй яшчэ ў школьныя гады. У дзяўчыны любоў да музыкі проста не магла не з'явіцца, бо расла яна ў сям'і, дзе не ўяўляюць жыцця без песні, мастацтва. Маці і бацька, бабуля і дзядуля, брат — усе вельмі любяць спяваць, і кожны можа іграць на тым ці іншым музычным інструменце. У доме Касаевых — фартэпіяна і акардэон, гітара і гармонік. А Святлана зрабіла для сябе адзіны і канчатковы выбар — фартэпіяна, закончыла па яго класу музычную школу. Але была ў яе душы пастаянная патрэбнасць пісаць музыку самой. Адна за адной пачалі з'яўляцца яе песні.

Спявае, колькі сабе памятае, і Ларыса Міхаленка. Ужо ў першым класе стала ўдзельніцай гарадскога фестывалю мастацкай самадзейнасці, прысвечанага 30-годдзю Перамогі. У творчай біяграфіі Ларысы — таксама музычная школа па класу фартэпіяна. І як у Святланы — спробы ў аўтарскай песні.

Лёс звёў дзяўчат на матэматычным факультэце ГДУ. Цяпер яны з усмешкай успамінаюць, як былі спачатку канкурэнткамі на факультэцкім конкурсе «Ану, першакурснікі!» Штуршком для аб'яднання дзвюх творчых натур у адно цэлае стала прапанова старшакурснікаў: «Паспрабуйце выступаць разам». З таго часу вядзецца адлік творчай біяграфіі іх песеннага саюза. Дзяўчаты спяваюць аб міры, каханні, дружбе, усім, што блізка сэрцу кожнага чалавека. За паўтара года ў іх было шмат выступленняў у адказных конкурсах і фестывалях.

«Другое дыханне», новы творчы ўздым з'явіліся з прыходам у іх невялічкі калектыў студэнта біялагічнага факультэта Алега Сацюка. Юнаку таксама вельмі блізка аўтарская песня. Сам ён, праўда, музыку не піша, але сур'ёзна займаецца ігрой на скрыпцы. Быў час, калі Алег перастаў іграць на ёй. Але знаёмства з песнямі С. Касаевай і Л. Міхаленка настолькі ўзрушыла яго, што ён проста не змог не вярнуцца да свайго ранейшага захаплення. І вось цяпер яго пранікнёная ігра на скрыпцы вельмі ўдала дапаўняе выступленне дзяўчат.

Творчая сустрэча з салістамі студэнцкага клуба «Маладосць» С. Касаевай, Л. Міхаленка і А. Сацюком, на якой прагучалі песні, напісаныя дзяўчатамі раней, і зусім новыя, песні савецкіх кампазітараў, пераканаўча паказала: поспех прыходзіць да тых, хто не спыняецца на паўдарозе ў сваіх пошуках, а знаходзіць усё новыя фарбы.

**Т. НІКАЛАЕВА.**



**НА ЗДЫМКУ: Л. Міхаленка, А. Сацюк, С. Касаева пасля творчай сустрэчы з гледачамі.**

Фота П. Страіцелева.

# НЕ ЗАБУДЗЕМ ТРАДЫЦЫЙ БАЦЬКОЎ

У студэнтаў, слухачоў факультэта «Чалавек і кніга» народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання адбылася сустрэча з воінамі, якія выконвалі свой інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане.

Вечар адкрыў афіцэр Гомельскага гарнізона І. Р. Марцін. Яму давялося дапамагаць афганскаму народу адстойваць заваёвы красавіцкай рэвалюцыі. На грудзях Ігара Рыгоравіча — ордэн Чырвонай Зоркі. Ім ён узнагароджаны за выдатную службу, здзейснены подзвіг.

Пяцікурснік фізічнага факультэта Міхаіл Жукевіч прыйшоў на сустрэчу, каб таксама падзяліцца сваімі ўспамінамі аб службе ў Афганістане. Побач з камсамольскім значком на лацкане яго пінжака — медаль «За адвагу».

З вялікай увагай слухалі ўсе і ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны дацэнта В. Р. Сіманава. Нялёгкі, складаны лёс у Вячаслава Рыгоравіча. Вучобу перапыніла вайна. Баявыя дзеянні ў радах Чырвонай Арміі, палон. Адзін з уцёкаў адтуль быў удалым. Потым — удзел у партызанскай барацьбе, дзеючая армія. Штурм Кенігсберга, баі ў Манчжурыі. А пасля дэмабілізацыі — працяг вучобы, навуковая работа. І вось ужо шмат гадоў Вячаслаў Рыгоравіч аддае свае веды студэнтам, выхоўвае моладзь.

А потым студэнты выступалі з эстраднымі мініяцюрамі, песнямі, вершамі. Цёпла сустракалі ўсе прысутныя выступленні А. Іванейчыка, М. Пракапенка, Т. Кляпковай, Ю. Трацэнкі.

У той вечар у студэнцкім кафэ быў пакладзены пачатак моцнай дружбы студэнтаў і воінаў Савецкай Арміі, ветэранаў.

**А. КІРУШКІН, студэнт гр. Ф-14 фізічнага факультэта.**

## МЕРЫ ПРЫНЯТЫ

# ДЛЯ НЕДАПУШЧЭННЯ ПАРУШЭННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ

**У нашай газеце за 22 лістапада быў змешчаны матэрыял «Мацаваць дысцыпліну» з пасяджэння рэктарата. У ім ішла размова аб выніках праверкі захавання выкладчыкамі і супрацоўнікамі працоўнай дысцыпліны, прыводзіліся факты асобных парушэнняў правілаў унутранага распарадку.**

**10 снежня па універсітэту выдадзены загад аб спагнаннях, накладзеных на парушальнікаў працоўнай дысцыпліны. За спазненне на лекцыі загадчык кафедры гісторыі КПСС В. У. Матусевіч, дацэнты А. І. Максімовіч, Л. А. Салохіна, асістэнт І. І. Лячэк з кафедры аналізу гаспадарчай дзейнасці, ст. выкладчыца М. Ф. Рудзінская з кафедры нямецкай і французскай моў і выкладчыца Г. Я. Пратапопава з кафедры англійскай мовы строга папярэджаны.**

**Загадчыку кафедры фізікі цвёрдага цела прафесару В. А. Балакіну і дацэнту кафедры агульнай фізікі В. Р. Пінчуку ўказана на неабходнасць строгага захавання правілаў афармлення ад'езду ў службовую камандзіроўку.**

**Старшаму інжынеру лабараторыі «Сінтэз» Ц. П. Раманаву, ст. н. с. А. І. Разанцаву, м. н. с. А. І. Парукаву і лабаранту кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі Л. М. Епішавай за спазненне на работу без уважлівых прычын строга ўказана.**

**Ад загадчыка лабараторыі «Сінтэз» дацэнта У. М. Мізгайлава запатрабавана ўзмацніць кантроль за работай падначаленых яму супрацоўнікаў.**

**Дэкану эканамічнага факультэта прафесару У. Д. Арэшчанку, дэкану фізічнага факультэта дацэнту М. В. Максіменку ўказана на недастатковы кантроль за выкананнем правілаў унутранага распарадку і арганізацыяй вучэбнага працэсу ў групах.**

**Ад дэканаў факультэтаў, загадчыкаў кафедр і кіраўнікоў іншых структурных падраздзяленняў запатрабавана ўзмацніць кантроль за выкананнем правілаў унутранага распарадку з мэтай паляпшэння працоўнай дысцыпліны сярод выкладчыкаў і супрацоўнікаў.**

**Звернута ўвага ўсяго прафесарска-выкладчыцкага саставу і супрацоўнікаў, што пры паўтарэнні падобных фактаў парушэння правілаў унутранага распарадку будуць прымацца больш строгія меры.**

## НА ШЛЯХУ ПЕРАБУДОВЫ

# ВЫМЯРЭННЯМ — ДАКЛАДНАСЦЬ

За апошнія гады ў нашым універсітэце значна ўзрасла роля навуковых даследаванняў па важнейшай тэматыцы. У сувязі з гэтым даволі актуальным стала і іх метралагічнае забеспячэнне (МЗ), якое патрабуе дакладных вымярэнняў і строгага захавання патрабаванняў стандартаў. Аднак з-за недастатковага ўзроўню метралагічнай падрыхтоўкі прафесарска-выкладчыцкага саставу, навуковых супрацоўнікаў і работнікаў службы МЗ ва універсітэце вельмі спрошчана ўяўляецца МЗ НДР.

Метралагічнае забеспячэнне навуковых даследаванняў — гэта комплекс работ, накіраваных на атрыманне правільнай інфармацыі аб даследуемых працэсах і аб'ектах. Ён ахоплівае шэраг пытанняў: ацэнку дакладнасці параметраў распрацоўваемых тэхналагічных працэсаў і прыстасаванняў; ацэнку іх дакладнасці, правільны выбар метадаў сродкаў вымярэнняў пры правядзенні эксперыментальных даследаванняў; забеспячэнне дакладнасці вынікаў вымярэнняў, правільнага выкарыстання метралагічных тэрмінаў і паняццяў і г. д.

Як правіла, навуковыя даследаванні ва універсітэце маюць фундаментальны характар і вынікі прадстаўляюцца ў выглядзе навуковай справаздачы. Метралагічнае забеспячэнне гэтых работ, у тым ліку і дысертацый, практычна не праводзіцца. Што датычыць навуковых даследаванняў непасрэдна па МЗ, то яны толькі пачынаюцца. Тым не менш, у літаратуры ўжо ёсць пэўныя прапрацоўкі па МЗ навуковых даследаванняў. Асноўнымі відамі гэтых работ у ВНУ з'яўляюцца метралагічныя прапрацоўкі (МП) і экспертыза (МЭ). Гэта — справа службы стандартызацыі універсітэта. Яна павінна быць пашырана, укамплектавана ў асноўным выпускнікамі фізічнага факультэта і прадстаўніком кожнага факультэта, які прайшоў курсы павышэння кваліфікацыі. Навуковае кіраўніцтва па МЗ НДР павінна ажыццяўляцца нашай кафедрай праз пастаянна дзеючы навуковы семінар. У такіх умовах можна вырашаць задачы метралагічнага абслугоўвання сродкаў вымярэнняў (улік, рамонт, праверку), МП і МЭ справаздач аб НДР, распрацоўку неабходнай навукова-тэхнічнай дакументацыі (стандартаў прадпрыемства, інструкцый, методык), ацэнку сіл і магчымасцей самой метралагічнай службы і выпрацоўку форм яе ўзаемадзеяння з усімі кафедрамі ГДУ. Каб работа скранулася з месца, набыла паскарэнне, неабходна загадам па універсітэту распрацаваць і зацвердзіць «Часовае палажэнне аб аддзеле стандартызацыі і метралогіі». Прыкладны пералік асноўных задач наступны: распрацоўка тэарэтычных, метадычных, тэхніка-эканамічных, арганізацыйна-прававых асноў МЗ НДР ва універсітэце; правядзенне МЭ справаздач НДР, тэхнічных заданняў на НДР, а таксама метадычных кіраўніцтваў і вучэбных дапаможнікаў; арганізацыя ўліку і фарміравання парку сістэмы вымярэнняў (СВ), рэгулярнай праверкі прымяняемых у НДР СВ, метралагічнай атэстацыі распрацаваных кафедрамі нестандартызаваных СВ (НСВ), стварэнне банка метадаў вымярэнняў, распрацоўка прынцыпаў іх класіфікацыі і рэкамендацыі па рацыянальнаму прымяненню, арганізацыя і правядзенне навуковых даследаванняў з мэтай распрацоўкі метадаў і сродкаў вымярэнняў. Уключаецца таксама распрацоўка і ўкараненне АСК «Метралогія», якая складаецца з дзвюх інфармацыйна-пошукавых сістэм (метадаў і сродкаў вымярэнняў); аналіз эфектыўнасці выкарыстання СВ і ўстанаўленне рацыянальнай наменклатуры парка СВ, арганізацыя пракату СВ (універсітэт можа стаць галаўной арганізацыяй у г. Гомелі); падрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі выканаўцаў НДР у галіне метралогіі і МЗ НДР; выкананне асабліва дакладных вымярэнняў па заказах падраздзяленняў універсітэта і пабочных арганізацый.

Такі шырокі спектр задач можа стаць штуршком для сістэмнага комплекснага падыходу да праблемы МЗ НДР.

Функцыяніраванне асноўных падсістэм МЗ НДР ўяўляецца наступным: фармальна-адміністратыўны (галоўны метролаг — намеснікі дэканаў па НДР — намеснікі загадчыкаў кафедр па НДР), а таксама нефармальны і ў перспектыве найбольш выніковы (метролагі-куратары аддзела — эксперты-метролагі кафедр).

Падрыхтоўка кантынгента экспертаў-метролагаў кафедр — новага кампанента сістэмы МЗ НДР — заклікана забяспечыць дасягненне патрэбнага ўзроўню МЗ усіх выконваемых ва універсітэце навукова-даследчых работ. Статус эксперта-метролага павінен быць замацаваны «Часовым палажэннем аб эксперце-метролагу кафедры».

Важнейшым кампанентам сістэмы МЗ НДР на сённяшні дзень з'яўляецца матэрыяльна-тэхнічная база, г. зн. парк СВ. Паўстала неабходнасць прывядзення яго ў адпаведнасць з патрабаваннямі, вынікаючымі з выконваемых НДР. Гэта пастаноўка на ўлік і метралагічны кантроль усіх СВ ва універсітэце праз АСК, пазбаўленне ад непрыгодных, фізічна і маральна ўстарэлых і набыццё новых сучасных СВ.

Аднак улік СВ, як і яго аўтаматызацыя — толькі адна са складаючых комплекса работ па метралагічнаму абслугоўванню СВ. Іншыя — гэта рамонт і праверка серыйна выпускаемых СВ і метралагічная атэстацыя (МА). Натуральна, гэта работа павінна быць праведзена сумесна з кафедрай фізічнай метралогіі пры адпаведным выдзяленні плошчаў, штатных правяральшчыкаў і інжынераў рамонтнікаў.

Усё больш важнай складаючай часткай метралагічнага абслугоўвання з'яўляецца атэстацыя НСВ. Хаця НДР ва універсітэце завяршаецца стварэннем адзінкавых экземпляраў вымяральных прыбораў, так ці інакш яны належаць метралагічнай атэстацыі. Для павышэння практычнай зацікаўленасці распрацоўшчыкаў у метралагічнай атэстацыі НСВ патрэбны матэрыяльныя і маральныя стымулы.

Не менш важнымі з'яўляюцца і ўласныя навуковыя даследаванні метралагічнай накіраванасці, якія праводзяцца на кафедры фізічнай метралогіі. Напрыклад, распрацоўка метадаў высокадакладных (на ўзроўні эталона) вымярэнняў шурпатасці паверхні, значэнне квантавага выхаду люмінісцэнцый, індзікацыі СВЧ палей і інш. Створаная вымяральная лабараторыя па ўказаных пытаннях з'яўляецца першым этапам МЗ НДР нашай кафедры. Мы лічым неабходным стварэнне гаспразліковай абласной вымяральнай лабараторыі пры ГДУ. Функцыі яе могуць быць не толькі ў рамках забеспячэння адзінства і дакладнасці вымярэнняў.

Неабходна забеспячэнне іх аптымальнай дакладнасці. Тут разумеецца такая дакладнасць вымярэнняў, пры якой мінімізіруюцца, напрыклад, сума агульных затрат і страт, абумоўленых: забеспячэннем патрабуемых якасці і колькасці сродкаў вымярэнняў, методык іх выканання, неабходнасцю пастаяннага падтрымання іх патрабуемага ўзроўню; няправільнымі рашэннямі, прымаемымі па выніках вымярэнняў па прычыне адрознення прымяняемых метадаў і сродкаў ад ідэальных. Могуць, у выпадку неабходнасці, прымяняцца і іншыя крытэрыі аптымізацыі.

У цяперашні час распрацоўваюцца і рэалізуюцца праграмы МЗ буйных комплексных народнагаспадарчых праблем. Такім чынам, праблема МЗ перарастае з галіновай у міжгаліновую. У святле гэтага МЗ НДР ва універсітэце варта надаць асабліваe значэнне.

**М. АЛЯШКЕВІЧ,**
**загадчык кафедры фізічнай метралогіі, кандыдат фізіка-матэматычных навук.**

